БАНК ІДЭЙ

# Беларусь у Другой сусветнай вайне:

*прафесійная гістарыяграфія, ідэалогія і «народная» версія*

Уладзімір Лобач, красавік 2026







Праблематыка Другой сусветнай вайны была і ёсць актуальнай для еўрапейскай гістарыяграфіі і культуры памяці ў цэлым, а расійская агрэсія супраць Украіны зрабіла паралелі з падзеямі страшнай вайны асабліва злабадзённымі. Пры гэтым можна заўважыць, што апеляцыю да «Вялікай перамогі» над нацызмам як ідэалагічнае абгрунтаванне «праведнай вайны» ў XXI ст. выкарыстоўваюць як расійскія агрэсары, так і ўкраінцы, што вымушаны абараняць сваю краіну. Аднак жорсткая інструменталізацыя гісторыі і «войны памяці» – гэта рыса не толькі крывавай расійска-ўкраінскай вайны, але ў большай ці меншай ступені ўласцівая ўсяму ўсходнееўрапейскаму культурнаму і грамадска-палітычнаму ландшафту, дзе Беларусь займае вельмі адметнае, але зусім не ўнікальнае месца. Паказальна, што рыторыку, звязаную з падзеямі Другой сусветнай вайны, актыўна выкарыстоўвалі канфліктуючыя бакі падчас масавых пратэстаў 2020 г. у Беларусі.

> *З 2020 года прапагандай актыўна выкарыстоўваецца тэрміналогія Другой сусветнай для інтэрпрэтацыі сучасных падзей. Апісанне апанентаў рэжыму Лукашэнкі суправаджаецца эпітэтамі «нацысты», «паліцаі», «калабаранты». Адзначым, што падчас пратэстаў 2020 года спекуляцыі гістарычным наратывам ажыццяўляліся абодвума бакамі канфлікту: у дачыненні да МУС былі ўведзеныя цэтлікі «карнікі», «фашысты», а рэжым нярэдка называлі «акупацыйным». Канструяваўся вобраз новай партызанскай барацьбы, а адна з акцый пратэсту ў лістападзе 2020 года нават мела назву «Марш супраць фашызму» [Мартыновский 2022: 49].*

Для значнай колькасці еўрапейскіх краін гісторыя Другой сусветнай вайны – гэта, пераважна, гісторыя нацысцкай акупацыі. Народы, якія не ўваходзяць у кароткі пералік «краін-пераможцаў» нацызму (СССР, ЗША, Вялікабрытанія, Францыя), мусяць выбудоўваць уласную гістарычную візію самай трагічнай падзеі XX ст. У гэтай гісторыі цэнтральнае месца займаюць не кіраўнікі дзяржаў, палкаводцы, вызначальныя бітвы на франтах ці тытанічныя намаганні ў тыле па пераводзе эканомікі на ваенныя рэйкі, але зусім іншыя рэаліі вайны. Вобразна кажучы, калі Масква асацыяваная з вялікім парадам Перамогі над нацысцкай Германіяй у 1945 г., то Мінск суадносіцца з Парадам партызанаў у ліпені 1944 г.

У нацыянальных наратывах гісторыі акупацыі сутнасна важнымі паўстаюць тры дзеючыя актары: **вораг** (агрэсар, акупант), з якім суадносяцца гвалт, тэрор, масавыя забойствы і разбурэнні; **ахвяры акупантаў** (грамадзяне краіны, знішчаныя, зняволеныя, вывезеныя на прымусовыя працы) і **героі** (удзельнікі руху супраціўлення і, у меншай ступені, камбатанты абарончых ці вызваленчых баёў, калі тыя мелі месца). Практычна ўвесь каласальны масіў даследаванняў і літаратуры (навуковай, папулярнай, публіцыстычнай), у краінах, якія падпалі пад акупацыю нацысцкай Германіі ў часе Другой сусветнай вайны, можна падзяліць паводле тэматыкі на тры азначаныя катэгорыі. У сваю чаргу, такі падзел зусім не азначае, што нацыянальныя гістарычныя наратывы не ўтрымліваюць у сабе «заімглёных тэм» і «болевых» для грамадства кропак, якія перыядычна становяцца пунктамі гарачых дыскусій.

У Польшчы сапраўдны шок выклікала публікацыя кнігі Яна Томаша Гроса «Суседзі», у якой на прыкладзе мястэчка Ядвабна быў паказаны актыўны саўдзел шараговых палякаў у Халакосце [Gross 2000]. Не менш вострыя спрэчкі выклікала і даследаванне Яна Грабоўскага, прысвечанае ўдзелу польскай крымінальнай паліцыі часоў акупацыі ў пераследзе і забойстве габрэяў [Grabowski 2020]. Жорсткую грамадскую палеміку ў Літве абудзіла кніга Руты Ванагайтэ «Нашы», у якой было паказана, як актыўна спрычыніліся літоўцы да Халакосту ўжо ў першыя месяцы нямецкай акупацыі [Ванагайте 2016]. З другога боку, у даследаванні Петраса Станкераса, прысвечаным літоўскім паліцыянтам, што ваявалі на баку Германіі, абсалютна не згадваецца тэрор гэтых падраздзяленняў супраць мірнага насельніцтва беларускіх вёсак і ўдзел у Халакосце, а вымалёўваецца вобраз сапраўдных патрыётаў Літвы, якія толькі ваявалі з «арміяй бальшавікоў і бальшавіцкіх партызанаў» [Станкерас 2009: 165]. Аднак калі ў названых краінах вострыя і не заўсёды прыемныя тэмы выклікаюць шырокі рэзананс, становяцца прадметам грамадскіх дыскусій і новых гістарычных даследаванняў, то гістарычная памяць пра Другую сусветную вайну і гістарычная палітыка ў Беларусі выбудоўваюцца іншым чынам.

Афіцыйны гістарычны наратыў у Рэспубліцы Беларусь у дачыненні да «Вялікай Айчыннай вайны» канцэптуальна ўспадкоўвае ўсе ключавыя пункты савецкай міфалогіі, але з папраўкай на беларускую спецыфіку. Вялікую ўвагу, што надаецца вайне прапагандай, ідэалогіяй і навуковым дыскурсам, наўрад ці можна лічыць штучнай, бо падзеі 1939-1945 гадоў сталі для беларусаў сапраўднай нацыянальнай траўмай.

> *Другая сусветная вайна ёсць натуральным цэнтральным пунктам для выбудоўвання беларускай ідэнтычнасці. Відаць, не было іншай гістарычнай падзеі, якая б мела мацнейшы ўплыў на сучасную Беларусь, чым гэты глыбока траўматычны канфлікт, які ў Беларусі ўсё яшчэ называюць Вялікаю Айчыннаю вайною [Рудлінг 2010: 91].*

Грамадскі кансэнсус адносна знакавасці Другой сусветнай (Вялікай Айчыннай) вайны ў кантэксце нацыянальнай гісторыі і сучасных механізмаў ідэнтычнасці пацвярджаецца і даследаваннямі беларускіх сацыёлагаў.

*Найважнейшым гістарычным міфам, які канстытуе сучасную беларускую нацыянальную ідэнтычнасць, з'яўляецца памяць аб перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне, несупярэчлівасць і спрошчанасць гэтай памяці толькі спрыяе ўзгодненасці ўяўленняў аб мінулым [Ластовский 2009: 98].*

Пры гэтым, як і ў савецкі час, у афіцыйным наратыве акцэнт робіцца на «гераізме савецкага народа», непарушным баявым братэрстве з расіянамі, трагічнай ахвярнасці беларусаў у часе нацысцкай акупацыі, усенароднай падтрымцы партызанскага руху, які і стаўся грунтам фармавання вобразу Беларусі як «рэспублікі партызанкі».

*Аляксандр Лукашэнка з самага пачатку падмацоўваў сваю палітычную легітымнасць пастаянным зваротам да савецкіх міфаў аб «братэрстве» з Расіяй і калектыўным гераізме часоў Другой сусветнай вайны. На момант пачатку савецкага праекту нацыянальная самасвядомасць у Беларусі была параўнальна слабай, і за семдзесят гадоў кіраваныя з Масквы мясцовыя ўлады не рабілі амаль ніякіх саступак нацыянальным пачуццям беларусаў. Менавіта таму найгалоўны пасляваенны міф аб «партызанскай рэспубліцы» паспяхова спрыяў культывацыі савецкай лаяльнасці [Льюис, Федор, Журженко 2018].*

Уяўленне пра знакавасць і значнасць тэмы Вялікай Айчыннай вайны для беларускай акадэмічнай навукі, гістарычнай палітыкі і ідэалогіі БССР – РБ даюць наступныя лічбы. З канца 1940-х і да 2010-х гадоў у Рэспубліцы было апублікавана больш за 11 тысяч навуковых прац па Вялікай Айчыннай вайне і абаронена звыш 100 доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый [Литвин 2015: 17]. Нягледзячы на тое, што асаблівага «вальнадумства» і перагляду ранейшых савецкіх дактрын у працах афіцыйных гісторыкаў, а тым больш у навучальных праграмах і падручніках, не дапускалася, беларуская публічная прастора ў 2000-2010-я гады даволі імкліва насычалася навуковымі працамі, якія прадстаўлялі альтэрнатыўны савецкаму (постсавецкаму) погляд на беларускую рэчаіснасць перыяду Другой сусветнай вайны. Грунтоўныя даследаванні гісторыкаў[1], пераважна замежных, якія былі прысвечаныя найбольш вострым пытанням акупацыйнай рэальнасці на Беларусі (калабарацыя, супярэчнасці і разнастайнасць партызанскага руху, акупацыйны рэжым, Халакост), былі даступныя кожнаму цікаўнаму чалавеку ў перакладзе на беларускую мову і легальна прадаваліся ў дзяржаўнай мінскай кнігарні «Акадэмкніга» альбо на спецыялізаваных сайтах. Згаданыя працы адыгралі ключавую ролю для шматвектарнага і разнабаковага асэнсавання падзей Другой сусветнай вайны ў Беларусі і фармавання новых даследчыцкіх падыходаў. Акрамя таго, вялікае значэнне для фармавання сучаснай гістарычнай веды ў галіне нацыянальнай гісторыі мелі незалежныя гістарычныя часопісы («Беларускі гістарычны агляд», «ARCHE. Пачатак», «Наша гісторыя»), выданне і распаўсюд якіх, за рэдкімі выключэннямі, з боку дзяржавы не забараняўся і не пераследваўся.

Сітуацыя кантраляванага «гістарычнага плюралізму», а таксама пэўныя захады дзяржаўных структур па ўшанаванні памяці ахвяраў Халакосту дазволілі гісторыку Андрэю Катлярчуку зрабіць даволі спрыяльную выснову адносна гістарычнай палітыкі ў РБ.

*Прычыны кардынальных зменаў у гістарычнай палітыцы Беларусі датычна Другой сусветнай вайны не паддаюцца выразнаму паліталагічнаму аналізу, бо ліберальная паводле кірунку палітыка памяці праводзіцца пад кіраўніцтвам аўтарытарнага рэжыму. [...] Думка некаторых беларускіх даследнікаў аб закансерваванні і ў Беларусі «савецкага» канону памяці падаецца памылковай [Катлярчук 2013: 18].*

Перыяд адноснай «лібералізацыі» і «мяккай беларусізацыі», які пачаўся пасля згортвання рэпрэсій, што суправаджалі прэзідэнцкія выбары 2010 г. і стаў найбольш відавочным пасля анексіі Крыма Расіяй і падзей на ўсходзе Украіны ў 2014 г [Ramanava 2023: 5], прывёў не толькі да ўмацавання беларусацэнтрычнай мадэлі ў гістарычных даследаваннях і сістэме адукацыі, але і да пэўных змен у дзяржаўнай палітыцы памяці. Размова ідзе пра «нацыяналізацыю» перамогі над нацызмам альбо пра «дэманапалізацыю» права Расіі на «Вялікую Перамогу».

---

1. К'яры, Бернгард (2008). *Штодзённасць за лініяй фронту: Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941-1944 г.).* Мінск: Беларускі Гістарычны Агляд; Снайдэр Тымаці (2013). Крывавыя землі. Еўропа паміж Гітлерам і Сталіным. Мінск: Медысонт; Бракель Аляксандр (2013). *Адносіны паміж савецкімі партызанамі і цывільным насельніцтвам Беларусі пад нямецкай акупацыяй (1941–1944 гг.).* «ARCHE. Пачатак», 1, с. 303–337. Яго ж. *Пад чырвонай зоркай і свастыкай: Баранавіччына ў 1939-1944 гг.* Смаленск: Інбелкульт; Бартушка, Марк (2014). *Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941–1944 гг.*, Смаленск: Інбелкульт; Рэйн, Леанід (2015). *Каралі і пешкі: калабарацыя ў Беларусі ў час Другой сусветнай вайны.* Смаленск: Інбелкульт; Мусял, Богдан (2018). *Савецкія партызаны ў 1941-1944 гг. Міфы і рэчаіснасць* Смаленск: Інбелкульт ды інш.

*І калі савецкі міф пра «партызанскую рэспубліку» падкрэсліваў уклад беларусаў у агульнасаюзную вайсковую славу, то ягоная версія, якая прасоўваецца рэжымам Лукашэнкі, нацыяналізавала гэты міф далікатна, але цалкам адчувальна: беларуская нацыя цяпер уяўляецца галоўным актарам гераічнага супраціву ваеннай пары [Льюис, Федор, Журженко 2018].*

На семантычным узроўні дыстанцыянаванне ад Масквы адбылося пры выбары новага, уласна беларускага, сімвала перамогі – яблыневай квецені, якая не толькі ўключала ў сабе колеры афіцыйнага нацыянальнага сцяга – белы, чырвоны і зялёны, але падкрэслівала адрознасць ад «георгіеўскай стужкі», што стала трывала асацыявацца з расійскай агрэсіяй на ўсходзе Украіны. З другога боку, беларуская «кветка перамогі» процістаўлялася і «чырвоным макам» – агульнаеўрапейскаму сімвалу перамогі над нацызмам і ахвяр, панесеных у страшнай вайне.

*Рэжым Лукашэнкі ўпадабаў абсалютна новы і таму семантычна пусты сімвал, які адначасова і адмаўляў расейскую гегемонію памяці, выяўленую ў георгіеўскай стужачцы, і дыстанцываўся ад заходнееўрапейскага наратыву, засяроджанага на ахвярах. Беларускі кейс, такім чынам, уяўляе сабой арыгінальны лапікавы ўзор, які складаецца з перапрацаваных савецкіх сцежак, які ў адзін і той жа час пацвярджае еўразійскую ідэнтычнасць краіны – адмаўляючы сканцэнтраваныя на ахвярах заходнія наратывы і патрабуючы ўшанавання ўсесаюзнай перамогі – і фармуе асобную, нерасійскую прастору памяці [тамсама].*

Супярэчлівасць гістарычнай палітыкі беларускіх уладаў, калі ў падручніках і акадэмічных выданнях вялося пра «усенародную падтрымку партызанскага руху», а ў дзяржаўнай кнігарні можна было набыць манаграфію, якая аспрэчвала гэты тэзіс ды паказвала праявы гвалту з боку партызанаў у адносінах да мірнага насельніцтва, была абумоўлена шэрагам фактараў, сярод якіх немалаважнае месца займала практыка Лукашэнкі балансаваць паміж Масквой і Захадам, што стала цалкам відочнай пасля расійскай агрэсіі на ўсходзе Украіны. Але канфігурацыя палітычнага, інфармацыйнага, навуковага і адукацыйнага ландшафтаў у Беларусі, калі рэжым сутыкнуўся з экзыстэнцыйнай пагрозай з боку беларускага грамадства запатрабавала ад уладаў актывізацыі намаганняў у сферы гістарычнай памяці дзеля легітымізацыі рэжыму праз перафарматаванне савецкага наратыву Другой сусветнай вайны

## Пратэсты 2020 і «генацыд беларускага народа»

Самыя масавыя і маштабныя ў найноўшай гісторыі Беларусі пратэсты супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў у 2020 г. сталіся для ўладаў сапраўдным шокам. Спробы маргіналізаваць удзельнікаў пратэстаў праз публічнае атаясамленне іх з дэвіянтнымі сацыяльнымі групамі («наркаманамі, прастытуткамі, крымінальнікамі») былі загадзя правальныя, як праз несувымернасць пазначаных груп з сотнямі тысяч пратэстоўцаў, так і таму што падобныя «абвінавачанні» з боку ўладаў высмейваліся на масавых шэсцях абсалютна карнавальным чынам [Сацук 2020]. Надзвычай жорсткае задушэнне пратэстаў, адміністрацыйны і крымінальны перасьлед іх удзельнікаў пакідалі адкрытым пытанне: якім чынам эфектыўна дэгуманізаваць і дыскрэдытаваць пратэстоўцаў і тым самым апраўдаць гвалт супраць іх, а таксама легітымізаваць «першую асобу» дзяржавы і яе ўладныя паўнамоцтвы.

Зварот да гісторыі ў яе ключавых момантах як да інструмента палітыкі і прапагандысцкіх маніпуляцый не ёсць выключнай асаблівасцю беларускага рэжыму, а ёсць, хутчэй, заканамернасцю палітычнага развіцця чалавецтва. Апеляцыя да «слаўнага гістарычнага мінулага» вельмі часта выкарыстоўваецца дыктатарскімі і аўтарытарнымі рэжымамі для ўласнай легітымізацыі. Не дзіўна, што Лукашэнка ў гэтым сэнсе амаль дакладна паўтарае маніпуляцыі гісторыяй, якія практыкуе Пуцін.

*Пуцін пачаў свой трэці прэзідэнцкі тэрмін пасля беспрэцэдэнтных дэмакратычных пратэстаў, а першы год яго новага прэзідэнцтва быў абвешчаны «Годам расійскай гісторыі» (2012). Лукашэнка пачаў свой наступны тэрмін з масавых і працяглых пратэстаў у 2020 годзе, а 2022 год ужо быў абвешчаны «Годам гістарычнай памяці ў Беларусі» [Ramanava 2023: 11].*

Зразумела, што ў фокусе ўвагі дзяржаўнай ідэалогіі і прапаганды апынулася Вялікая Айчынная вайна як ключавая падзея беларускай гісторыі. Аднак «год гістарычнай памяці» выявіў, што парадыгма выкарыстання ваеннай праблематыкі істотным чынам змянілася. Гераічны канцэпт «рэспублікі-партызанкі» адыходзіць на другі план, а цэнтральнае месца ў афіцыйным наратыве займае вобраз «рэспублікі-ахвяры», якая панесла жудасныя страты ў часе вайны праз генацыд з боку нацыстаў ды іх памагатых. Трэба адзначыць, што катэгорыя «генацыд» у XXI ст. даволі адвольна выкарыстоўваецца ў розных нацыянальных традыцыях і асобнымі

аўтарамі, прычым гэтыя практыкі па-свойму трактуюць значэнне тэрміна, вызначэнне якому было дадзена ў «Канвенцыі аб папярэджанні генацыду і пакаранні за яго», прынятай на Генеральнай Асамблеі ААН 9 снежня 1948 г. у Парыжы[2]. Не закранаючы канкрэтныя выпадкі асобных народаў (габрэі, армяне, украінцы ды інш.), адзначым, што катэгорыя «генацыд» закліканая не толькі ахарактарызаваць найбольш трагічную старонку нацыянальнай гісторыі (Халакост, рэзня армян у Асманскай імперыі ў 1915 г., Галадамор ва Ўкраіне 1932-1933 гг.) і дамагчыся прызнання гэтай трагедыі на міжнародным узроўні, але і вызначыць вінаватых у маштабным злачынстве (нацысты, туркі, камуністычны рэжым). У гэтым плане паказальна, што выкарыстанне тэрміна «генацыд» у беларускай найноўшай традыцыі не ёсць выключнай манаполіяй афіцыйнага гістарычнага наратыву.

Захар Шыбека трактуе «генацыд» як знішчэнне немцамі вязняў лагероў (рускіх ваеннапалонных, беларусаў, еўрапейскіх камуністаў і антыфашыстаў), габрэяў і цыганоў Беларусі і Еўропы, але чамусьці не прыгадвае ахвяр знішчаных беларускіх вёсак [Шыбека 2003: 316-317]. Іншы акцэнт у разуменні «генацыду» можна было знайсці на сайце мемарыяльнага комплексу «Хатынь» яшчэ задоўга да падзей 2020 года, калі пад ахвярамі генацыду перадусім разумеліся знішчаныя беларускія вяскоўцы [Катлярчук 2013: 19]. Ужо пасля падаўлення пратэстаў 2020 г. і ва ўмовах жорсткіх палітычных рэпрэсій у Беларусі Святлана Ціханоўская ўбачыла працяг генацыду 1940-х гадоў у актуальнай сітуацыі, калі віноўнікам злачынстваў выступаюць ужо не нацысты, а рэжым Лукашэнкі: «Генацыд беларускага народу не застаўся ў 1940-х гадах – ён адбываецца ў Беларусі проста зараз»[3]. У сваю чаргу, Зянон Пазняк разглядае дзеянні расійскіх уладаў і савецкага рэжыму[4] як сістэмны генацыд беларускага народа, што доўжыцца стагоддзямі.

Трэба разумець, што выказванні беларускіх апазіцыйных палітыкаў былі рэакцыяй на канцэпцыю «генацыду беларускагаа народу», якая стала асноўным ідэалагічным і прапагандысцкім канструктам беларускіх уладаў, пачынаючы з 2022 года, прызначаным для ўсіх сегментаў грамадства не з нагоды нейкіх урачыстасцяў, але ў рэжыме «нон-стоп». Ад гэтага моманту гісторыя Другой сусветнай вайны падлягае максімальнай інструменталізацыі з мэтай маніпуляцыі грамадскай думкай.

> *Пасля масавых пратэстаў у Беларусі ў 2020 годзе і спроб палітычнага рэжыму Аляксандра Лукашэнкі іх задушыць склалася новая сітуацыя ў галіне культуры памяці і палітыкі памяці. Некаторыя гісторыкі, якія ўдзельнічалі ў пратэстным руху, былі звольненыя з акадэмічных і адукацыйных устаноў, а цэнзура і прапаганда, якія абапіраюцца на пэўныя інтэрпрэтацыі мінулага, значна ўзмацніліся. Палітычная інструменталізацыя гісторыі і маніпуляцыі з выкарыстаннем тэмы Другой сусветнай вайны дасягнулі максімуму [Bratachkin 2022: 187].*

Сур'ёзнасць і абавязковасць новай канцэпцыі, распрацаванай у нетрах Генеральнай пракуратуры, была юрыдычна падмацавана законам «О геноциде белорусского народа» (05.01.2022), асноўны сэнс якога палягаў у атаясамленні «националистических формирований» з нацыстамі і абагульненні ўсіх ахвяраў злачыннай палітыкі тэрмінам «беларускі народ», пад якім разумеюцца «советские граждане, проживавшие на территории Белорусской Советской Социалистической Республики в годы Великой Отечественной войны и (или) послевоенный период». Адсюль здымаецца пытанне пра Халакост як трагедыю габрэйскага народу. Але самай важкай часткай закона «О геноциде» сталася ягоная рэпрэсіўная кампанента ў выглядзе дапаўнення Крымінальнага кодэкса РБ артыкулам 130.2 «Отрицание геноцида белорусского народа», які прадугледжвае зняволенне тэрмінам да пяці гадоў [Закон].

> *Закон «Аб генацыдзе беларускага народа» фактычна замацоўвае манаполію аўтарытарных уладаў Беларусі на інтэрпрэтацыю гісторыі і дае дзяржаве дадатковы карны інструмент у выглядзе крымінальнага пакарання за выказванне меркаванняў, якія адрозніваюцца ад «адзіна праўдзівых» дзяржаўных інтэрпрэтацый гісторыі [Bratachkin 2022: 202].*

---

2. У дадзенай Канвенцыі пад генацыдам разумеюцца наступныя дзеянні, якія здзяйсняюцца з намерам знішчыць, поўнасцю або часткова, якую-небудзь нацыянальную, этнічную, расавую або рэлігійную групу як такую: a) забойства членаў такой групы; b) прычыненне сур'ёзных цялесных пашкоджанняў або разумовага расстройства членам такой групы; c) наўмыснае стварэнне для якой-небудзь групы такіх жыццёвых умоў, якія разлічаны на поўнае або частковае фізічнае знішчэнне яе; d) меры, разлічаныя на прадухіленне нараджэння дзяцей у асяроддзі такой групы; e) гвалтоўная перадача дзяцей з адной чалавечай групы ў іншую. https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/genocide.shtml

3. https://tsikhanouskaya.org/ru/news/svetlana-tixanovskaya-genocid-belarusskogo-naroda-proisxodit-pryamo-sejchas.html

4. https://www.youtube.com/watch?v=zPZev1ea3SQ

Маніпулятыўны характар і сапраўдная прагматыка канцэпцыі генацыду, патранаванай Генеральнай пракуратурай, становяцца відавочнымі, калі азнаёміцца з праграмнай публікацыяй гэтага ведамства. У выданні «Геноцид белорусского народа» (2022) асноўная ўвага засяроджана не на злачынствах гітлераўцаў, а на спробах паставіць знак роўнасці паміж нацыстамі і прыхільнікамі дэмакратычных перамен, якія выйшлі на масавыя пратэсты ў жніўні 2020 г. [Геноцид 2022, 138-172]. Адпаведна, задушэнне мірных пратэстаў і жорсткія палітычныя рэпрэсіі трактуюцца як справядлівая барацьба «с проявлениями экстремизма и терроризма под нацистской символикой» [Геноцид 2022, 138]. Мабілізуючы рэсурс памяці пра трагічныя для Беларусі падзеі Другой сусветнай вайны, беларускія ўлады такім чынам змагаюцца як супраць унутраных «здраднікаў», так і супраць знешніх ворагаў.

> *Больш за тое, сама рэальная сітуацыя ўспрымаецца як вайна — вайна не новая, а тая ж бясконцая і вечная вайна дабра супраць зла, найвышэйшым апагеем якой стала Вялікая Айчынная вайна. Аднак супрацьстаянне на гэтым не сканчаецца. У гэтай перспектыве беларускія ўлады выступаюць у якасці апошняй сцяны і абаронцы парадку перад тым, як скаціцца ў хаос. Калі няма адрознення паміж Вялікай Айчыннай вайной і сучаснасцю, то існуе поўная ідэнтыфікацыя паміж лагерам прыхільнікаў Лукашэнкі і Савецкай Арміяй, гэтак жа, як і паміж палітычнай апазіцыяй і нацыстамі. Такім чынам, няма таксама розніцы паміж санкцыямі еўрапейскіх дзяржаў і падпаламі беларускіх вёсак, бо яны ўспрымаюцца толькі як асобныя фазы аднаго і таго ж супрацьстаяння [Lastouski 2022: 166].*

Прапагандысцкія штампы «гістарычная памяць» і «генацыд беларускага народу», якія не маюць нічога агульнага з навуковымі даследаваннямі, запаланілі разнастайныя сферы жыцця беларускага грамадства: ад СМІ да адукацыйных праграм школ і ўніверсітэтаў, ад мастацкіх выставаў да музейных экспазіцый. Аднак найбольшую небяспеку ўяўляе сабой насаджэнне прапагандысцкай мадэлі падзелу свету на «белае» і «чорнае», «сваіх» і «чужых» у сістэме школьнай адукацыі. Падручнік «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны», распрацаваны не навукоўцамі і педагогамі, а супрацоўнікамі пракуратуры, мае тры версіі (для 1-4, 5-9 і 10-11 класаў) і, такім чынам, мусіць ахапіць усе ўзроставыя катэгорыі школьнікаў. Паказальны раздзел, прысвечаны беларускім калабарантам перыяду нацысцкай акупацыі, дзе ключавой стае выснова пра выбары 2020 г., «на которых более 80% граждан отдали свои голоса за кандидатуру действующего Главы государства – А. Лукашенко», але «деструктивные силы» імкнуліся здзейсніць дзяржаўны пераварот, практыкуючы гвалт, пагромы і «использовали нацистские лозунги («Жыве Беларусь») и символику (полотнище бело-красного-белого цвета, изображение герба «Погоня»)» [Толкачев и др. 2023: 48]. У дадзеным выпадку слушным падаецца меркаванне Аляксея Ластоўскага, што падобныя «падручнікі» не толькі створаны без належнай навуковай экспертызы, скажаюць гістарычныя факты і ў цэлым не адпавядаюць сваім зместам псіхалогіі малодшых школьнікаў, але ўяўляюць сабой «мову нянавісці», якую супрацоўнікі пракуратуры прагнуць зрабіць неад'емнай часткай беларускай школьнай адукацыі [Ластоўскі 2025: 25].

## Спаборніцкая мартыралогія

Няма сумнення, што нявінныя ахвяры вайны і змагары з нацызмам па праве займаюць сваё пачэснае месца ў кожным нацыянальным пантэоне памяці і свядомасці людзей, але адначасна немагчыма не заўважыць, як крывавая трагедыя становіцца грунтам для палітычных спекуляцый і ідэалагічных войнаў сучаснасці. Цімаці Снайдэр, даследчык сталінскага і гітлераўскага тэрору ва Ўсходняй Еўропе, якую ён вобразна назваў «крывавымі землямі», пазначыў небяспеку «спаборніцкай мартыралогіі».

> *Прамаўляючы раз за разам перабольшаныя лічбы, еўрапейцы запускаюць у свае культуры мільёны зданяў людзей, якіх ніколі не існавала. На жаль, падобныя фантомы валодаюць уладай. Тое, што пачынаецца як спаборніцкая мартыралогія, можа скончыцца мартыралагічным імперыялізмам [Снайдер 2015: 521].*

Цяперашняя гістарычная палітыка беларускіх уладаў, ідэалагічным ядром якой выступае канцэпцыя «генацыду беларускага народа», мае некалькі ўзаемазвязаных ліній рэалізацыі. Перадусім, гэта татальная зачыстка навуковай, адукацыйнай, інфармацыйнай і сацыяльнай прасторы ад «здраднікаў», што вылілася ў масавыя арышты і звальненні нелаяльных рэжыму навукоўцаў, выкладчыкаў універсітэтаў, школьных настаўнікаў, музейных супрацоўнікаў – людзей, якія ў значнай ступені фармавалі гістарычную (шырэй – гуманістычную) думку. Акрамя таго, былі ліквідаваныя незалежныя СМІ, інстытуцыі і выдавецтвы, якія займаліся папулярызацыяй гісторыі, што фактычна звяла да нуля магчымасці для свабодных навуковых дыскусій унутры краіны. На гэтым фоне загадам Лукашэнкі (04.02.2022) ствараецца «Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы», рэальнай задачай якога ёсць татальны кантроль над сферай гістарычнай веды на безальтэрнатыўнай аснове.

Уласна культурны прадукт (выданні, падручнікі), створаны ў рамках рэалізацыі канцэпцыі «Генацыд беларускага народа», яскрава паказвае, што ўлады дзеля аргументацыі бяруць не вынікі навуковых даследаванняў і абмеркаванняў, але «спаборніцкую мартыралогію» ў самых яскравых і непрыхаваных формах, што дэманструе прапагандысцкі характар усёй кампаніі. Заўважым, што «гонка за лічбамі» адбываецца з мэтаю абгрунтаваць статус Беларусі як «краіны-ахвяры», найбольш пацярпелай ад вайны, але практычна адсутнічае ў партызанскай праблематыцы.

Каласальная для Беларусі лічба ахвяр Другой сусветнай вайны – 2,2 (2,4) млн. чалавек («кожны чацвёрты») прынятая ў савецкай гістарыяграфіі і, збольшага, пацверджаная сучаснымі гісторыкамі [Вабішэвіч і інш. 2007: 488; Литвин 2015: 344], раптам стае недастатковай і павялічваецца да «больш чым 3 мільёнаў» намаганнямі не навуковых інстытуцый і новых методык падлікаў, а рашэннем Генеральнай пракуратуры РБ [Геноцид 2022: 3], якая, у сваю чаргу, арыентавалася на лічбу («кожны трэці»), бяздоказна агучаную Лукашэнкам яшчэ ў 2004 г. [Катлярчук 2013: 19].

Адпаведным чынам узрастае і колькасць маштабных нямецкіх экспедыцый супраць партызанаў, у якіх найбольш цярпела мірнае насельніцтва беларускіх вёсак. Калі раней гісторыкі сыходзіліся на лічбе 140 [Вабішэвіч і інш. 2007: 529], то цяпер з падачы работнікаў пракуратуры яна ўзрастае да «187 буйных карных экспедыцый (па матэрыялах крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа)» [Толкачев и др. 2023: 21].

Не можа не ўражваць неверагодная дынаміка росту колькасці «беларускіх Хатыняў» (вёсак, знішчаных акупантамі разам з іх жыхарамі) і спаленых сельскіх паселішчаў. Акадэмік Аляксандр Каваленя пафасна агучвае новыя лічбы, якія не маюць аніякага навуковага абгрунтавання, а ўзятыя з пратаколаў пасяджэння нейкай таемнай «временной межведомственной рабочей группы, созданной по инициативе Генеральной прокуратуры Республики Беларусь».

> *Калі раней лічылася, што ў гады вайны германскія варвары знішчылі на беларускай зямлі 9200 населеных пунктаў, у тым ліку спалілі 186 вёсак разам з жыхарамі, то на 30 красавіка 2025 г. устаноўлена новая колькасць трагедый беларускага народа. Агульны лік спаленых і разбураных вёсак складае 12 868 (рост на 40% – У.Л.), а ў «Хатынскім спісе» ужо не менш за 290 населеных пунктаў (рост на 56% – У.Л.) [Коваленя 2026: 7].*

«Гісторыкі» з пракурорскага асяроддзя не спыняюць сваю цынічную пагоню за лічбамі нават у тых выпадках, калі яна відавочна пярэчыць не толькі наяўным даследаванням, але і здароваму сэнсу. Гэта паказвае, што падобныя спекуляцыі на гісторыі крывавай вайны ёсць праявай сучаснай дзяржаўнай прапаганды, і адначасна сведчыць пра глыбокую абыякавасць і пагарду «гісторыкаў у пагонах» да рэальных ахвяр, якія панесла Беларусь у Другой сусветнай вайне.

> *Адзначым, што падручнікі фіксуюць і няўсталяванасць дыскурсу генацыду беларускага народу. Так, Трасцянец абвяшчаецца адным з самых буйных лагераў смерці, створаных нацыстамі, але агульная колькасць ахвяр падаецца як 206 500 чалавек (і ў падручніку для 11-га класа, і для ўніверсітэтаў), тым часам у падручніках па генацыду падаецца ацэнка Генеральнай пракуратуры ў 546 000 ахвяр. Такія радыкальныя разбежкі непазбежна вядуць да дэвальвацыі самога разумення колькасці ахвяр [Ластоўскі 2025: 20].*

Значнае павелічэнне панесеных страт цягне за сабой і новую фінансавую калькуляцыю, дзе пераразлікі, гэтаксама праведзеныя пракуратурай, проста агаломшваюць. Генеральны пракурор РБ Андрэй Швед у 2021 г. ацэньваў страты, панесеныя краінай, у 500 млрд. даляраў [Ходасевич 2021], але той самы чыноўнік праз два гады называе суму, амаль у 5 разоў большую – 2,3 трлн. даляраў![5]

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што маніпуляцыі гісторыяй уласцівыя не толькі сучаснай Беларусі. «Спаборніцкая мартыралогія» сталася адной з праяваў грамадска-палітычнага жыцця ў Польшчы апошніх дзесяцігоддзяў, дзе кіроўная партыя «Закон і справядлівасць» рабіла ўсё магчымае, каб прадставіць этнічных палякаў выключна ў якасці ахвяраў і герояў Другой сусветнай вайны і выключыць з нацыянальнага наратыву нават узгадкі пра магчымы саўдзел у злачынствах нацыстаў, у прыватнасці ў Халакосце. Не выпадкова, што і колькасць польскіх ахвяраў апошняй вайны змяняецца ў бок радыкальнага павялічэння. Калі ў 1993 г. гісторык Чэслаў Лучак піша пра 5,9 – 6 млн. загінулых польскіх грамадзян [Łuczak 1993, 683], то ў 2023 г.

5. https://belta.by/society/view/materialnyj-uscherb-dlja-belarusi-ot-dejstvij-fashistov-v-gody-vov-sostavil-ne-menee-23-trln-548710-2023/

у справаздачы Міністэрства замежных справаў РП пазначаецца лічба амаль удвая большая – 11,2 мільёна чалавек [Raport 2023, 16]. Новая калькуляцыя вымагае новых рахункаў, і ў красавіку 2023 г. Польшча падае іск да Нямеччыны ў памеры 1 532 170 млн даляраў [Raport 2023, 51]. Сутнасна важнай стае наступная тэза: «Сярод усіх еўрапейскіх краін Польшча панесла найвялікшыя чалавечыя і матэрыяльныя страты ў адносінах да агульнай колькасці насельніцтва» [Raport 2023: 13]. У сваю чаргу, беларускія даследчыкі разглядаюць як найбольш пацярпелы свой уласны народ [Литвин 2015: 344]. Але гэта не так істотна, бо хто будзе разбірацца ў лічбах, прызначаных выключна для ўнутранага ўжытку? Аглядаючы гэтыя нацыянальныя «гонкі за лічбамі», Цімаці Снайдэр зрабіў даволі песімістычны прагноз, які, на вялікі жаль, спраўдзіўся.

Я меў на ўвазе, што спроба манапалізаваць невымерныя пакуты «крывавых земляў» унутры адной нацыянальнай гісторыі можа прывесці да прадузятасці, варожасці і вайны. Тэарэтычна такая рызыка існуе для ўсіх народаў, якія насяляюць тэрыторыю «крывавых земляў». Але на практыцы зараз, калі я пішу гэтыя радкі вясной 2015 года, гэта, падобна, датычыцца Расіі [Снайдер 2015: 521].

Захопніцкая вайна Расіі супраць Украіны, якая пачалася 24 лютага 2022 года, перавяла тэрміны і паняцці «вайна», «фронт», «акупацыя», «паветраная трывога», «ваеннапалонныя», «бежанцы», «ахвяры сярод мірнага насельніцтва», «злачынствы супраць чалавечнасці» з кніжных катэгорый у актуальныя навіны, а для значнай часткі ўкраінцаў – у страшную і крывавую рэальнасць.

«Спаборніцкая мартыралогія» – не адзіная праява прапагандысцкага характару кампаніі «генацыд беларускага народа». Абавязковасць перыядычна звяртацца да гэтай тэмы для чыноўнікаў усіх узроўняў, профільных навукоўцаў, супрацоўнікаў музейных і культурных устаноў, а таксама СМІ за непрацяглы час ператварыла праблему пакут і ахвяр апошняй вайны ў набор пустых і бяздушных штампаў, што паўтараюцца як мантры з мэтай засведчыць лаяльнасць рэжыму, але не маюць ані каліва навуковай асновы і змястоўнага аналізу. Яскравым прыкладам можа быць праграмны артыкул акадэміка Кавалені «Память о Великой победе – духовная скрепа для новых поколений белорусской молодежи», сама назва якога патыхае прапагандысцкай пустатой. Тое ж датычыцца і зместу артыкула, які ўяўляе сабой набор ідэалагічных штампаў, а ў навуковым плане не мае ніякага значэння.

> *Во всех городах и районных центрах Беларуси три года полыхало неукротимое пламя борьбы молодых патриотов.*
> *Практически вся территория Беларуси была превращена в арену всенародного сопротивления германским захватчикам.*
> *Память о героических и трагических событиях войны важно сохранить генетически, чтобы не прерывалась связь поколений.*
> *У нас есть историческое и моральное право сегодня вписать золотом на скрижалях истории: «Мы – наследники Народа-Победителя!» [Коваленя 2026: 13-15].*

Як справядліва заўважыў Аляксей Ластоўскі, на змену актыўным эксперыментам уладных структураў у сферы гістарычнай памяці ў 2020-2022 гадах прыйшло пэўнае «акасцяненне» колішняй ініцыятывы, калі паўтарэнне ўстаноўленых формулаў стае важным само па сабе, без асэнсавання прамоўленага.

> *Таму ў асноўным захаванне гістарычнай памяці пасля 2022 года звялося да публічнай рыторыкі. Зразумела, што асноўная дыскурсіўная рамка ўжо сфарміравана («гераічныя подзвігі народа», «мы памятаем ахвяр»), але апошнім часам намецілася прыкметная тэндэнцыя. Інтэрпрэтацыя Вялікай Айчыннай вайны стала ўражліва аднастайнай, выступоўцы дзяржаўных СМІ ў адзін голас паўтараюць амаль аднолькавыя фразы [Lastouski 2025: 54].*

# Homo belli, альбо «гісторыя знізу»

Парадаксальнасць айчыннай гістарыяграфіі Другой сусветнай (Вялікай Айчыннай) вайны (безадносна палітычнай арыентацыі аўтараў) палягае ў тым, што яна будуецца вакол жорстка вызначанай трыяды актараў: **ворагі** (акупанты ды іх памагатыя) – **ахвяры – героі** (рух супраціву). У той жа час беларускія сяляне, якія на пачатку 1941 г. складалі ў БССР 77,8 % насельніцтва [Литвин 2015: 341], выступаюць у даследаваннях «маўклівай большасцю», якая ўзгадваецца толькі ў сувязі з «усенароднай падтрымкай партызанскага руху» альбо як ахвяра нямецкіх карных экспедыцый.

Падобны падыход, калі суб'ектамі гісторыі выступаюць адно канфліктуючыя бакі (акупанты і партызаны), прыводзіць да таго, што пераважная частка насельніцтва акупаванай Беларусі застаецца на старонках

даследаванняў вымушаным аб’ектам гвалту і ўціску, «маўклівай большасцю», чый голас, візія, усведамленне і інтэрпрэтацыя драматычных падзей у гісторыі краіны ў разлік не прымаюцца ці пераказваюцца ўскосна, з рэляцый акупацыйных уладаў ці камандзіраў партызанскіх аддзелаў. Між тым, менавіта сельскае насельніцтва Беларусі, як бы гэта не здавалася парадаксальным, сталася асноўным актарам у трохгадовай трагедыі нацысцкай акупацыі, без якога ўсе размовы як пра партызанскі рух у прыватнасці, так і пра лёс беларускай нацыі ў цэлым не маюць ніякага сэнсу.

Уласны 30-гадовы досвед палявых этнаграфічных даследаванняў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння паказаў, што ўзгадкі пра вайну прысутнічалі ў размовах з вяскоўцамі пастаянна і ў абсалютна розных кантэкстах. Для ўсіх пажылых людзей без выключэння «вайна» сталася ўніверсальным хранометрам, які падзяліў іх асабістае жыццё і ўсю сацыякультурную рэчаіснасць на тры няроўных перыяды: «да вайны», «у вайну», «пасля вайны». Аповяды пра вайну, якія давялося запісваць, прадэманстравалі істотную розніцу паміж гераічным пафасам вайны ў афіцыйнай гістарыяграфіі і ўспамінамі вяскоўцаў, дзе крыніцай гвалту маглі выступаць не толькі акупанты і калабаранты, але і савецкія партызаны. Крыўда забытых і нікому не патрэбных людзей, пра якіх не ўзгадваюць падчас бравурных парадаў Перамогі, вельмі ёміста ўвасобілася ў словах простай вясковай жанчыны.

> *Гора цяпнулі. У ноч партызаны, удзень – немцы. Усяк было. Давай партызанам хлеб, сала, анучкі, рукавіцы! А тады узвод зваўся – дзесяць чалавек, прывядуць у зямлянку, турнуць, і ты іх абмывай нядзелю, кармі, абшывай. А ў нядзелю другі (узвод) прыдзе.* ***І нас цяпер не празнуюць, што мы лапаткамі капалі, сеялі, у жорны малолі, і нада – у нядзелю дзесяць чалавек кармілі. Ніхто нас ні шчытаіць ніяк***[6].

Адсюль вельмі важнае значэнне меў «антрапалагічны разварот» гістарычнай навукі, які больш выяўна ўвасобіўся ў «вуснай гісторыі», калі аб’ектам увагі даследчыкаў сталіся «звычайныя людзі» – удзельнікі і сведкі знакавых падзей: калектывізацыі, сталінскіх рэпрэсій, вайны і нямецкай акупацыі, пасляваеннага голаду альбо Чарнобыльскай катастрофы. «Гісторыя знізу» заўжды завязаная на асабісты жыццёвы досвед чалавека і, нягледзячы на суб’ектыўнасць, мае надзвычайную каштоўнасць, бо надае гістарычным падзеям чалавечае вымярэнне праз эмоцыі, пачуцці, ацэнкі, уяўленні асобы з уласцівай ёй карцінай свету, сістэмай жыццёвых каштоўнасцяў, культурных арыенціраў і сацыяльных сувязей. Тое ж у поўнай ступені датычыцца і «Homo belli» – «чалавека вайны», якім можа быць і шараговы салдат на фронце, і падлетак на акупаванай тэрыторыі. У гэтым сэнсе важкім станавіцца асабісты досвед перажывання чалавекам страшных падзей ваеннага ліхалецця, у тым ліку рэакцыя яго цела (эмоцый, адчуванняў) на ваенную рэчаіснасць, зафіксаваныя ў памяці [Лобач 2025: 225–226].

Прыход беларускіх гісторыкаў з дыктафонамі ў вёску, які пачаўся ў 2000-х гадах, быў абумоўлены разбурэннем камуністычнай сістэмы і відавочным крызісам марксісцкай ідэалогіі ў сістэме гуманітарных ведаў, што, ў сваю чаргу, здымала табу з вялікай колькасці раней забароненых тэм і рабіла дасяжным у тэарэтычным і інструментальным плане набыткі заходняй гуманітарыстыкі. Гэта найперш датычылася «вуснай гісторыі» (oral history), якая сталася для беларускіх гісторыкаў «навіною», хоць ужо мела на Захадзе трыццаць гадоў паспяховага развіцця [Томсон 2003: 73–82].

Гэтая тэндэнцыя была агульнай для Усходняй (посткамуністычнай) Еўропы і, у сваю чаргу, вызначала актуальную праблематыку даследаванняў, калі «сярод найбольш папулярных тэмаў вуснай гісторыі на постсавецкай прасторы вылучаюцца трагедыя Халакосту, «забытыя ахвяры» і «невядомая» гісторыя Другой сусветнай вайны, калектывізацыя і голад пачатку 1930-х гадоў, рэпрэсіі, масавыя прымусовыя міграцыі і перасяленні, эміграцыя і гісторыя дыяспары, палітычныя, рэлігійныя і іншыя віды пераследавання з боку камуністычнага рэжыму» [Ластоўскі 2015: 211]. Агульным месцам пры гэтым становіцца зварот вусных гісторыкаў да тых сацыяльных груп (вяскоўцы, остарбайтэры, рэпрэсаваныя), хто быў пазбаўлены права голасу і ўдзелу ў фармаванні гістарычнай памяці грамадства.

Даследаванні ў рэчышчы вуснай гісторыі ў Беларусі звязаны перадусім з актыўнасцю адносна невялікай групы гісторыкаў-аднадумцаў (Вольга Іванова, Ірына Кашталян, Ірына Махоўская, Ірына Раманава, Алесь Смалянчук ды інш.), якія сыходзіліся ў тым, што новы метад ёсць дзейсным і эфектыўным у справе «дэсаветызацыі» гістарычнай навукі, дае дадатковыя магчымасці ў вывучэнні «праблемных тэм» XX ст., а таксама слугуе своеасаблівым арыенцірам на прынцыпы і здабыткі заходняй гістарыяграфіі.

---

6. Зап. У. Лобач у 2006 г. ад Ж., 1919 г.н. у в. Старына Ушацкага р-на (дзеля захавання перанальных дадзеных суразмоўцы тут і далей пазначаецца толькі яго пол, год нараджэння, час і месца запісу).

Праца ў гэтым накірунку прывяла да арганізацыйнага афармлення наватарскай гістарычнай ініцыятывы на платформе «Беларускага архіва вуснай гісторыі» (БАВГ). Даволі інтэнсіўныя і маштабныя палявыя даследаванні ў канцы 1990 – 2010 гадоў сталі грунтам для шэрагу навуковых публікацый, сярод якіх працы, прысвечаныя перыяду Другой сусветнай вайны, занялі даволі значнае месца[7]. Паслядоўна і эфектыўна вынікі ўласных палявых даследаванняў у беларускай вёсцы выкарыстоўваюць гісторыкі Яўген Грэбень (разнастайныя аспекты нацысцкай акупацыі Беларусі з гледзішча сялян)[8] і Алена Сумко, якая акцэнтавала ўвагу на сістэме жыццезабеспячэння вяскоўцаў пасля вызвалення Беларусі[9]. Значэнне сведкаў гісторыі цяжка пераацэніць. Факт фізічнага зыходу прадстаўнікоў ваеннага пакалення і недасяжнасць іх сведчанняў у бліжэйшай перспектыве пазначаецца шмат якімі даследчыкамі, але ў Беларусі гэтая сітуацыя набывае асаблівы драматызм. У той час, калі ў краінах Балтыі, Польшчы і Украіне праводзіцца маштабная і грунтоўная праца па захаванні прамоўленай гісторыі, беларуская ідэалагічная машына ў афіляцыі з навуковымі інстытуцыямі цалкам ігнаруе «гісторыю знізу» па прычыне яе нязручнасці і неадпаведнасці пафаснаму афіцыйнаму наратыву.

Асабісты экспедыцыйны досвед і запісаныя матэрыялы разам са здабыткамі калег дазваляюць выявіць прынцыповыя адрозненні «вясковай гісторыі» вайны ад яе прафесійнага, пісьмовага варыянту, а таксама вызначыць ключавую праблематыку народных успамінаў, што далёка не заўсёды супадае з наборам тэм, на якія абапіраюцца акадэмічныя гісторыкі[10].

## Мова апісання

У выпадку, калі размова ідзе пра вайну і акупацыю, даследчыкі сутыкаюцца з тым, што вясковы чалавек апісвае драматычныя падзеі мовай, вельмі адрознай ад таго слоўніка, які выкарыстоўвае не толькі прапаганда, але лічыцца агульнапрынятым у навуцы і «адукаваным грамадстве» увогуле. Падобную разбежку ў тэрміналогіі трапна пазначыла Алейда Асман: «Калі ж Халакост стаў Халакостам? Праблема, вывучэнню якой прысвечана мноства даследаванняў, пачынаецца з самой назвы. Ні злачынцы, ні ахвяры не ведалі, што ўдзельнічаюць у Халакосце» [Ассман 2014: 165]. Праводзячы наўпроставыя паралелі, можна сказаць, што амаль ніхто са шматлікіх сведкаў апошняй вайны, з якімі давялося сустракацца ў беларускіх вёсках, нічога не сказаў ні пра «Вялікую Айчынную», ні пра «Другую сусветную вайну» і тым больш не засведчыў, што перажыў «генацыд беларускага народу».

Заўважу, што ў цяперашняй вёсцы нават старыя людзі глядзяць беларускае тэлебачанне і слухаюць радыё, але ўвесь клішаваны набор, які адтуль бесперапынна ліецца, так і не ўвайшоў у іх лексікон. Нават такія звыклыя для «гарадскіх» словы, як «акупацыя», «акупацыйны рэжым», «калабарацыя», «остарбайтэры», «гераізм», «траўма», «ахвяра» не абслугоўваюць поле ваенных значэнняў у моўнай карціне свету пажылых вяскоўцаў ці маюць зусім іншае значэнне. Паказальны выпадак з «ахвярай», якая ў народнай культуры разумеецца выключна як дар Богу, прынесены чалавекам у храм ці да святой крыніцы, але не мае значэння «забітага на вайне ці пацярпелага ад яе». У сваю чаргу гэта прыводзіць да пытання, ці ўсведамляюць сябе «ахвярамі вайны» людзі, што перажылі жах акупацыі, але знайшлі ў сабе моц аднавіць гаспадаркі, выгадаваць

7. Смалянчук, А. 2005. *Вобразы партызанаў у памяці жыхароў Слонімшчыны.* «Гістарычны альманах»,11: 4-20; Яго ж: *Память на Пограничье (на примере памяти о Второй мировой войне)* [В:] Кравцевич А., Смоленчук А., Токть С. Белорусы: нация Пограничья. Вильнюс: ЕГУ, 2011: 159-206; Яго ж: *Трагедыя Халакосту і яго прычыны ў вуснай гісторыі.* Homo Historicus 2016. Гадавік антрапалагічнай гісторыі. рэд. А. Смаленчук. Вільня: Беларускі калегіум, 2016:172-183; Раманава І., Махоўская І. Мір: гісторыя мястэчка, што расказалі яго жыхары. Вільня: ЕГУ, 2009; Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі. Пад рэд. д-ра гіст. н. А. Смаленчука. Мінск: Зміцер Колас, 2015; Іванова, В. Прамоўленая гісторыя: XX ст. у памяці жыхароў беларускай вёскі. Мінск : Зміцер Колас, 2018.

8. Гребень, Евгений. 2018. *Партизаны в воспоминаниях очевидцев нацистской оккупации Беларуси.* [In:] History: Sources and People, Saleniece, I., ed., XXIII: Daugavpils: Daugavpils University Academic Press «Saule»: 90-97; Яго ж: *Германская оккупация Беларуси 1941-1944 гг. глазами детей.* [В:] Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф. Мінск : МДЛУ, 2022: 34-40; Яго ж: *Борьба за выживание гражданского населения Беларуси в ходе карательных операций нацистов (по материалам устной истории).* Вестник ПГУ. Гуманитарные науки, 2024,1: 81-83.

9. Сумко Алена. 2019. *Выжыванне пасля вызвалення: вёска паўночнай Беларусі ў дыскурсе вуснай гісторыі 1944–1945 гг.* «Вестник ПГУ. Гуманитарные науки», 9: 65-72; Яе ж: *Пасляваеннае жабрацтва ў дыскурсе вуснай гісторыі Віцебшчыны.* «Вестник ПГУ. Гуманитарные науки», 2020, 9: 142-147.

10. Успаміны пра вайну, іх аналіз і навуковая інтэрпрэтацыя сталіся грунтам для напісання манаграфіі «Антрапалогія акупацыі. Нямецка-савецкая вайна ва ўспамінах вяскоўцаў паўночнай Беларусі», якая зараз рыхтуецца да друку.

і паставіць на нагі дзяцей, ці тут патрэбныя нейкія іншыя катэгорыі, каб ахарактарызаваць іх нязломнасць і жыццёвую стойкасць?

Ключавыя словы наратываў пра акупацыю вельмі чалавечныя і простыя для разумення ў любым вымярэнні (персанажным, сацыяльным, ландшафтным, гастранамічным, акцыянальным і эмацыйным): немцы, партызаны, паліцаі, палонныя, сям'я, суседзі, аднавяскоўцы, хата, вёска, мястэчка, дарога, лес, балота, хлеб, соль, голад, страх. Катэгорыі «смерці» і «гвалту», як правіла, ніколі не маюць форму назоўніка, а выказваюцца толькі дзеясловамі: забілі, растралялі, спалілі, памёр, рабавалі, білі, здзекаваліся. Гэтая нібыта «дробязь» паказвае акцыянальнае вымярэнне абстрактных паняткаў у праекцыі на рэальнае жыццё.

Што датычыцца самой трагічнай падзеі, якая падзяліла жыццё людзей на «да» і «пасля», то яна мае толькі адно найменне – *вайна*, што не вымагае ніякіх дадатковых удакладненняў («Вялікая Айчынная» ці «Другая сусветная»), бо гэта адзіная і самая страшная вайна, якую ім давялося перажыць.

## Лакальны характар гісторыі

Персаналізацыя мінуўшчыны на розных узроўнях яе актуальнасці (уласна чалавечая і «свяшчэнная» гісторыя) у праекцыі на лакальны культурны ландшафт робіць апошні свайго роду *гісторыкацэнтрычным*, калі найбольш сутнасныя гістарычныя падзеі (ад біблейскага патопу да вайны з Напалеонам) адбыліся ў самых бліжэйшых ваколіцах канкрэтнай вёскі. Гэткую ж лакальную гісторыкацэнтрычнасць мы знаходзім і ў наратывах беларускіх вяскоўцаў пра падзеі апошняй вайны і нацысцкай акупацыі. Вясковец (як дарослы, так і дзіця) вымярае «свой свет» уласным домам – вёскай – бліжэйшымі ваколіцамі, што адпаведным чынам выяўляецца і ў структуры ўспамінаў, дзе вылучаюцца тры ўзаемазвязаных лініі: *асабістая – сямейная – вясковая гісторыя*. Бітвы пад Масквой ці Сталінградам, пры ўсёй іх аб'ектыўнай значнасці для вынікаў Другой сусветнай вайны, для жыхара полацкай ці глыбоцкай вёскі – падзеі малавядомыя, бо ўся вайна, ад прыходу немцаў да іх выгнання, разгортваецца на ягоных вачах і толькі ў межах ягонага свету. Адсюль даследчык сутыкаецца з асабістым успрыманнем гісторыі канкрэтнага чалавека, якое рэлевантна ў маштабах лакальнай супольнасці і слаба карэлюе ў сваіх знакавых і значных момантах з прагматыкай «нацыянальнай гісторыі». «Звычайна нацыя занадта далёкая ад індывіда, каб ён лічыў гісторыю сваёй краіны чымсьці апрача вельмі шырокай рамкі, з якой яго асабістая гісторыя судакранаецца толькі ў нешматлікіх кропках» [Хальбвакс 2005: 40].

## Мазаічнасць і сітуацыйнасць

Лакальны характар вясковай гісторыі пра вайну ў немалой ступені вызначае яе *мазаічнасць і сітуацыйнасць*. Сельскі ландшафт Беларусі ўяўляе сабой сукупнасць мноства лакальных вясковых супольнасцяў, у якіх жыццёвая прастора, гаспадарчы ўклад, культурныя традыцыі, сістэма сацыяльнай арганізацыі і ўзаемадзеяння, сваяцка-суседскія сувязі маюць сваю спецыфіку ці, прынамсі, усведамляюцца грамадой як адметныя. Гэтая адметнасць ва ўспамінах пра акупацыю выходзіць на першы план і фармуе змест і адметнасць гэтай гісторыі. Гэта асабліва заўважна па тым, якое значэнне надаецца функцыянальнай і сімвалічнай ролі культурнага ландшафту, які выступае дзейсным актарам у жыцці чалавека і супольнасці ва ўмовах вайны. Адсюль вёскі ў Заходняй і Усходняй Беларусі, у лясной ці бязлесай мясцовасці, паблізу мястэчка ці побач з важнай транспартнай артэрыяй – гэта гісторыі адной і той жа вайны, але ў розных, часам вельмі адметных, варыяцыях. *Сітуацыйнасць* падзей у часе вайны ў немалой ступені абумоўлена знешнімі фактарамі, незалежнымі ад вяскоўцаў: паселішча трапляе ў зону жорсткіх баёў альбо знаходзіцца далёка ад іх, у вёску заходзіць аддзел СС альбо батальён латышскай паліцыі, у навакольных лясах дзейнічаюць «настаяшчыя» партызаны альбо «грабежнікі», пагарэльцам удалося схаваць сваю маёмасць у гаспадарчых ямах альбо тыя схованы апынуліся разрабаванымі. Але сітуацыйнасць – гэта і тое, які выбар робіць і паводзіць сябе «свой» чалавек у экстрэмальнай сітуацыі, калі, напрыклад, на парозе з'яўляецца знаёмы габрэй, што выратаваўся з растрэльнай ямы і просіць дапамогі.

У сукупнасці мазаічнасць акупацыйнага ландшафту і сітуацыйнасць экстрэмальнага жыцця паўплывалі на тое, што, нягледзячы на супольныя складнікі (немцы, партызаны, паліцыянты, гвалт, тэрор, нястача, голад), практычна кожная лакальная вясковая супольнасць Беларусі мела «сваю» вайну – адзін з мноства пазлаў агульнай трагічнай карціны. Пры гэтым мазаічнасць і сітуацыйнасць ва ўсведамленні ваенных падзей, пры агульным непрыняцці гвалту і забойстваў, якія прынесла акупацыя, выступаюць грунтам сялянскай разважлівасці ў ацэначных інтэрпрэтацыях страшнай рэчаіснасці. Ідэалагічны савецкі канструкт, калі

акупацыя інтэрпрэтуецца выключна ў чорна-белых фарбах, дзе партызаны і падпольшчыкі – сілы дабра, а немцы і калабаранты – увасабленне зла, ёсць слаба функцыянальным у вясковай гісторыі вайны, дзе канцэпты «дабра» і «зла» маюць уласнае вытлумачэнне і абсалютна канкрэтнае змястоўнае напаўненне. Адсюль вельмі негатыўна ацэньваюцца не толькі дзеянні карнікаў і паліцыянтаў, што вызначыліся забойствамі, але і партызанаў, якія займаліся гвалтам і рабаўніцтвам, а пазітыўнае значэнне набываюць учынкі не толькі «сваіх» людзей, але і «добрых немцаў», якія ў крытычнай сітуацыі ратавалі жыцці незнаёмых ім сялян.

## «Антыгістарычнасць»

Асаблівасцю вясковага наратыву з'яўляецца «*антыгістарычнасць*», калі пад гэтым разумець ігнараванне ці маргіналізацыю храналагічнага прынцыпу, які ёсць базавым для пісьмовай гісторыі. На першы план у апавяданнях пра вайну заўжды выходзіць прэцэдэнт, знакавая падзея ці з'ява (пачатак і канец вайны, карная экспедыцыя, смерць блізкіх, гвалтоўны згон у Нямеччыну, голад і г.д.), у той час як канкрэтныя даты могуць увогуле не называцца альбо быць вельмі прыблізнымі ці пераблытанымі. У гэтым сэнсе народнае апавяданне пра вайну – гэта тэкст, сканструяваны аўтарам з фрагментаў, якія, на яго думку, уласна і ўвасабляюць сутнасць вайны. «Відавочна селектыўнасць памяці і яе сацыяльная абумоўленасць. Гэта таксама, бадай, у большай ступені, чым іншых, датычыцца тых біяграфічных апавяданняў, у якіх прысутнічае вайна» [Filipkowski 2005]. Пры гэтым тыя сегменты ваеннай будзённасці, што мала чым адрозніваюцца ад рэалій мірнага часу (сяўба, жніво, выпас скаціны, гатаванне ежы, пранне бялізны ды іншыя гаспадарчыя клопаты), застаюцца ў ценю – пра іх увогуле не распавядаюць, калі толькі даследчык не прыкладзе адмысловых намаганняў.

## Ідэалагічная незаангажаванасць

Народнае апавяданне пра вайну пазбаўлена ідэалагічных канструктаў і пафасу, уласцівых прапагандзе і прафесійнай гісторыі, бо ўспаміны вяскоўцаў не закліканы ў чымсьці пераконваць і штосці даказваць, але выяўляюць лёс чалавека і калектыву ў сістэме базавых аксіялагічных катэгорый «дабро» і «зло». Іншымі словамі, людзі распавядаюць пра тое, як было, а не тое, як «правільна» трэба казаць. Як адзначыла Ганна Энгелькінг, «у гэтым апавяданні ўтрымліваецца вобраз свету, створаны групай, якая не спараджае гістарычных і палітычных ідэалогій: гэта яе ўласныя сэнсы, каштоўнасці і нормы, якія фармуюць грамадска-культурны космас і слугуюць крыніцай semiятычных катэгорый інтэрпрэтацыі рэчаіснасці» [Engelking 2018: 28].

Неўлучанасць вяскоўцаў у ідэалагічныя і навуковыя канструкты прыводзіць да сутнасных непаразуменняў, калі гісторык з пэўнай сумай пастэдаў спрабуе накладаць свае перакананні на жыццёвы досвед сялян. Так, на падставе экспедыцыйных даследаванняў Алесь Смалянчук прыйшоў да высновы, што ў зоне беларуска-польскага памежжа «практычна для ўсіх рэспандэнтаў вайна пачалася ў верасні 1939 г.», але «для большасці насельніцтва Беларусі **«дзякуючы» савецкай прапагандзе** (вылучана мной – У.Л.) вайна пачалася ў чэрвені 1941 г. з нападу гітлераўскай Германіі на СССР...» [Смоленчук 2011: 175].

У дадзеным выпадку відавочным становіцца механічны перанос перыядызацыі і ўласна канцэпта Другой сусветнай вайны, прынятых у гістарыяграфіі, на народнае ўспрыняцце гістарычных падзей, што і прыводзіць да высноваў, якія не адпавядаюць праўдзе сведкаў. Бо ад Браслава і да Беластока (на былых «Крэсах Усходніх») людзі гавораць не пра адну, але пра дзве адрозныя паміж сабой вайны: «нямецка-польскую» («савецка-польскую») і «нямецка-савецкую». Што да насельніцтва ўсходняй часткі БССР, то вайна для яго пачалася ў чэрвені 1941 г. не дзякуючы савецкай прапагандзе, але дзякуючы нямецкім бомбам і авангардам вермахта.

Здзіўляе імкненне гісторыкаў, якія нібыта грунтуюць свае даследаванні на заходняй метадалогіі, ставіць таўро «савецкай прапаганды» ва ўсіх выпадках, калі сведчанні людзей пярэчаць іх уласным перакананням. Так, Вольга Іванова знаходзіць уплыў афіцыйнага савецкага наратыву і прапаганды ў разнастайных сюжэтных лініях народных апавяданняў. Як праявы «афіцыйнага савецкага гістарычнага дыскурсу» даследчыца вызначае такія ацэнкі: «у польскай школе было цяжка вучыцца», «паліцаі плахія», «немцаў очэнь баялісь». Адлюстраваннем савецкай паваеннай свядомасці аўтарка лічыць крытычнае стаўленне сялян Заходняй Беларусі да польскіх уладаў, а «пашыраны сюжэт аб пакоры габрэяў перад непазбежным, габрэяў, якія не змагаліся» звязвае «з уплывам прапаганды, скіраванай на стварэнне міфа аб «гераічнай барацьбе савецкага народа» [Іванова 2018: 158, 357, 370]. Цяжка нават каментаваць такія тэзісы, бо з іх вынікае, што без уплыву савецкага гістарычнага дыскурсу беларускія сяляне распавядалі б пра «добрых паліцаяў» і пра тое, як яны «любілі немцаў», а заадно і польскую ўладу.

# Заімглёная гісторыя

Апрача неверагодна моцнага эмацыйнага фону, які робіць падзеі вайны па-чалавечы зразумелымі, «вясковая гісторыя», апавядаючы пра тое, «як было», міжволі выяўляе лакуны і скажэнні ў даследаваннях як прыўладных, так і незалежных гісторыкаў. Найлепей гэта заўважна на прыкладзе характарыстык, дадзеных беларускаму партызанскаму руху. Савецкая і постсавецкая гістарыяграфія трактуе гэты феномен выключна пазітыўна, пры гэтым заўжды акцэнтуецца «усенародная падтрымка партызанаў». Дзеля справядлівасці адзначым, што гларыфікацыя партызанаў уласцівая не толькі беларускай палітыцы памяці. «Улюбёнай даследчыцкай тэмай беларускіх гісторыкаў быў і застаецца савецкі партызанскі рух. Стаўся ён элементам грамадскай нацыянальнай міфалогіі, у гэткай жа ступені, як для палякаў АК, альбо для ўкраінцаў УПА [Mironowicz 2015: 21].

У даследаваннях, праведзеных у рэчышчы «вуснай гісторыі», калі чытач найперш бачыць «страшные картины партизанского разбоя и насилия» [Смоленчук 2011: 205], а злачынствы нацыстаў і калабарантаў застаюцца ў зацені, ад імя вясковых людзей ствараецца скажоная карціна акупацыйнай рэчаіснасці, якая павінна пераканаць у тым, што сведкі гісторыі памятаюць пра партызанскі гвалт, а вось вёскі, спаленыя карнікамі, не займаюць практычна ніякага месца ў іхніх рэгістрах памяці.

Акцэнт у сучасных, не залежных ад дзяржаўнага дыскурсу даследаваннях на гвалце і злачынствах савецкіх партызанаў цалкам зразумелы ў кантэксце таго, што гэта тэма замоўчвалася і ігнаруецца дагэтуль афіцыйным наратывам вайны. Злачынствы, гвалт, рабаванні і забойствы, якія здзяйснялі савецкія (а таксама польскія, украінскія і габрэйскія) партызаны ў беларускай вёсцы, пацверджаны як дакументальна, так і шматлікімі аповедамі сведкаў тых падзей. Але зводзіць увесь трагізм акупацыі толькі да дэвіянтных і злачынных паводзінаў партызанаў – гэта некарэктна спрашчаць гісторыю [Лобач 2025: 113–114]. Вясковая гісторыя выразна адрознівае партызанаў, якія займаліся гвалтам і рабункамі, ад тых, хто выяўляў тактоўныя паводзіны ў адносінах да мірнага насельніцтва.

> *А партызаны, вот тут стаяў Мядзведзява атрад, а сюды, пад Бягомаль, – гэта Ленінская брыгада.* ***Дык як нашы, як што-небудзь нада, прыйдзець, спросіць: тое, тое нада... Ага, гэта нашы, Мядзведзевы, а ўжо Ленінцы прыдуць у нашу дзярэўню, тыя ж ужо нахалам бралі.*** *Ну, гэта ўжо ня іхняя зона. А нашы парцізаны, нашы добра абрашчаліся. Цяперака, цяперашні свет не прайшла б дзяўчына па лесе. Цяперашнім светам, каб партызаны там былі. А мы з парцізанамі хадзілі. Значыт, дзялоў не мелі да дзяўчат, маладыя ж парцізаны былі. Падказвалі, дзе прыхінуцца, дзе схавацца, дзялоў не было. Гэта цяпер свет зусім другі стаў. Парадак нейкі, дысцыпліна нейкая была*[11].

Дарэчнай тут будзе заўвага Марка Бартушкі, што «карціна, якая паўстае пры разглядзе стасункаў паміж партызанамі і мясцовымі жыхарамі, была надзвычай складаная і далёка не адназначная, так што ўсялякія агульныя меркаванні будуць падавацца сумнеўнымі» [Бартушка 2014: 86]. Скрайнасці абодвух падыходаў – «савецкага» і «антысавецкага» – у разуменні партызанскага руху можна ахарактарызаваць як *практыку незавершанага сказу*, калі аўтары выбіраюць патрэбныя ім факты (словы) і ігнаруюць тыя, што пярэчаць іх уласным ідэалагемам. Гісторык Георгій Шэпелеў вельмі трапна ахарактарызаваў такі падыход як «*рэпарцёрскае канструяванне* гістарычнай падзеі, якое выхоплівае яе асобныя дэталі і ігнарue тыя, што не ўпісваюцца ў ідэйную платформу аўтара» [Шепелев 2023: 46].

Незразумелым ёсць гнараванне незалежнымі даследчыкамі тэмы «спаленых вёсак» – болевай кропкі найноўшай беларускай гісторыі. «Немодная» тэма практычна цалкам адсутнічае ў працах, напісаных па матэрыялах палявых даследаванняў [Смоленчук 2011; Іванова 2018], і гэта пры тым, што, напрыклад, у Германіі гэтае вымярэнне ваенных злачынстваў прыцягвае ўсё большую ўвагу. У 2024 г. выйшаў пераклад на нямецкую дакументальнай аповесці «Я з вогненнай вёскі...» («Feuerdörfer», перакладчык Thomas Weiler), у 2025 – калектыўная манаграфія, прысвечаная нацысцкаму тэрору супраць вясковага насельніцтва Усходняй Еўропы[12], якая абсурдным чынам была ўключана беларускім судом у спіс «экстрэмісцкай літаратуры»[13].

11. ФА ПДУ: Зап. У. Аўсейчык, У. Лобач у 2009 г. ад Ж., 1926 г.н. у в. Бірулі Докшыцкага р-на.

12. Verbrannte Dörfer. Nationalsozialistische Verbrechen an der ländlichen Bevölkerung in Polen und der Sowjetunion im Zweiten Weltkrieg. Herausgeber: Florian Wieler et al. Berlin: Metropol, 2025.

13. https://bannedbooks.penbelarus.org/extremist_list/

Адмова дэмакратычна арыентаваных беларускіх гісторыкаў ад даследавання ў гэтым кірунку азначае поўную манаполію прыўладнай гістарыяграфіі і прапаганды ў гэтай трагічнай праблематыцы. Суцэльнае дамінаванне «гісторыкаў у пагонах» ў рамках гэтай складанай тэмы прыводзіць, з аднаго боку, да спекулятыўнага, прапагандысцкага выкарыстання нацыянальнай трагедыі, каб заклеймiць дэмакратычны пратэстны рух як «ідэйных спадкаемцаў нацыстаў», а з другога боку, робіць практычна немагчымымі дыскусіі, крытычны аналіз і верыфікацыю ўведзеных у зварот архіўных дадзеных.

Аднак найбольш уражвае каласальны разрыў паміж афіцыйнай гістарыяграфіяй, прапагандай, пафасам СМІ і рэальнай палітыкай памяці ў сельскім ландшафце Беларусі. Амаль 30 гадоў палявога экспедыцыйнага досведу на абшарах паўночнай Беларусі дазваляюць засведчыць, што ў дзясятках выпадкаў на месцы спаленых вёсак і знішчаных людзей немагчыма знайсці хоць якога, нават самага сціплага мемарыяльнага знака. «Месцы памяці», актуальныя для нешматлікіх сведкаў вайны, з зыходам апошніх папрост зліюцца з прыродным ландшафтам.

Сума вясковых аповядаў пра габрэяў і іх трагічны лёс на беларускай зямлі выводзіць на праблематыку **памяці пра Халакост**, як складовай часткі памяці пра вайну і нацысцкую акупацыю. Шматлікія размовы з сялянамі выяўляюць тую ідавочную акалічнасць, што іх праўда і разуменне габрэйскай трагедыі выразна адрозніваюцца ад пастулатаў афіцыйнага наратыву вайны. Пры гэтым і ў працах незалежных гісторыкаў трагедыя беларускіх габрэяў займае маргінальнае месца.

> *Памяць пра Халакост аказалася, па сутнасці, маргінальнай як для дзяржаўнай культуры памяці, так і для апазіцыйнай, г.зн. як для нацыянальнай, так і для анацыянальнай. Нельга сказаць, што тэма Халакосту абсалютна «нябачная», з'яўляюцца новыя мемарыялы, памятныя дошкі, дзейнічаюць розныя адукацыйныя і даследчыя ініцыятывы, тут вялікая роля належыць дзейнасці Гістарычнай майстэрні ім. Леаніда Левіна ў Менску. У той жа час згадкі пра Халакост былі выключаныя з апошняй рэдакцыі школьных падручнікаў. Асноўная роля ў абазначэнні месцаў масавых пахаванняў, доглядзе за помнікамі, устанаўленні памятных знакаў на месцы гета належыць, у першую чаргу, яўрэйскім арганізацыям [Маховская 2021: 104].*

Страшная гібель габрэяў беларускіх мястэчак, якая нярэдка адбывалася на вачох іх вясковых суседзяў, ніколі і нідзе не прыгадваецца як гвалтоўная смерць безаблічных «савецкіх грамадзян», што ўласціва (пост) савецкай палітыцы памяці ў Беларусі.

> *Выступаючы, Лукашэнка апісвае ахвяр і ўдзельнікаў вайны з дапамогай катэгорый «савецкага народа», «савецкіх людзей», «працаўнікоў тылу», «грамадзян», «нашых людзей» і г.д. Так ствараецца і транслюецца максімальна абагульнены… вобраз Другой сусветнай вайны, у якім не звяртаецца ўвага на дыферэнцыяцыю падзей і ахвяр, якія адбыліся [Браточкин 2013: 67].*

Афіцыйная практыка гістарычнай калькуляцыі, калі прынцыпова важнай становіцца найбольшая лічба ахвяр, а назоўнік «савецкія грамадзяне» дазваляе не зважаць на адрозненні (беларусы, габрэі, палякі, татары, цыганы…), у вясковай аповесці вайны не працуе. Пры тым, што ва ўсіх выпадках, калі даваенны лакальны свет (мястэчка – вёскі) немагчыма памысліць як без беларусаў, так і без габрэяў, а ўспаміны пра спаленыя вёскі пераплеценыя з успамінамі пра знішчэнне гета, **вяскоўцы называюць рэчы сваімі імёнамі**. Ніякія афіцыйныя шыльды на помніках не адмяняюць у памяці людзей факту, *хто* менавіта быў забіты нацыстамі ды іх памагатымі. Прынцып беларускіх вяскоўцаў *называць рэчы сваімі імёнамі* вельмі важны не толькі ў справе праўдзівага асэнсавання «месцаў памяці», але і як змястоўны стрыжань гісторыі ўвогуле, у яе сялянскім фармаце, для якога не ўласцівая ні нацыяналістычная ідэалізацыя, ні прапагандысцкі пафас.

Гісторыя пра габрэяў, пачутая ў беларускай вёсцы, – гэта не гісторыя пра нейкі ідэальны свет выключна гарманічных стасункаў у даваенны час і пра «беларусаў-выратавальнікаў» габрэяў пад нямецкай акупацыяй, але гэта аповяд пра даўніх суседзяў, ва ўзаемаадносінах якіх прысутнічалі не толькі сяброўства, паразуменне, давер, прыязнасць, але і канфлікты, узаемныя крыўды з наборам не заўжды пазітыўных стэрэатыпаў з абодвух бакоў. Ваенная частка гэтай гісторыі таксама далёкая ад ідэалізацыі. Побач з успамінамі пра дапамогу і выратаванне габрэяў прысутнічаюць рэальныя гісторыі пра адмову ў дапамозе, практыка даносаў, рабункі габрэйскай маёмасці і актыўны ўдзел мясцовых калабарантаў у «канчатковым вырашэнні».

Нягледзячы на свой падкрэслена лакальны характар, вясковая гісторыя вайны і акупацыі выяўляе сутнасна важныя тэмы, якія не закранутыя альбо толькі кропкава пазначаныя ў прафесійнай нацыянальнай гістарыяграфіі. У прыватнасці, размова ідзе пра **феномен даносаў** – складаную і абсалютна недаследаваную праблему, **жаночы тэкст вайны**, дзе цэнтральным пунктам выступаюць жаночыя ролі ў вясковым соцыуме ва ўмовах акупацыі, а таксама пытанні *сэксуальнага гвалту і калабарацыі*, **дзіцячы свет вайны** (роля дзяцей

у экстрэмальнай сістэме жыццязабеспячэння, светаглядныя і каштоўнасныя мадэлі, асаблівасці памяці), **рытуальныя і фальклорныя аспекты акупацыі** (абрадавыя механізмы пераадолення крызісных сітуацый, сістэма сімвалічных паводзінаў і прадпісанняў, фальклорныя вобразы і метафары ваеннай рэчаіснасці), **сістэма жыццязабеспячэння** (экстрэмальная гастранамія, гігіена і санітарыя, народная медыцына ва ўмовах вайны), **культурны ландшафт акупацыі** (у народных аповядах становіцца відавочным, што культурны ландшафт выступае дзейсным актарам ваенных падзей, які шмат у чым вызначае лёс асобных людзей і лакальных супольнасцяў). Апрача таго, не выклікае сумнення, што нават у «традыцыйных» тэмах (акупанты, калабаранты, партызаны) вясковы наратыў выяўляе сваю пазіцыю, адрозную ад прафесійных гісторыкаў.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Кароткі аналітычны агляд асноўных падыходаў нацыянальнай гістарыяграфіі Другой сусветнай вайны ў праекцыі на ідэалагічныя мадэлі яе інтэрпрэтацыі і народны варыянт гісторыі акупацыі паказвае, што афіцыйны наратыў у асноўным наследуе савецкую традыцыю з яе пафасам «вялікай перамогі» і «гераізму савецкага народа». З другога боку, адбываецца «касметычная нацыяналізацыя» канцэпта перамогі палітычным рэжымам Лукашэнкі, што выяўляецца як на сімвалічным узроўні (сімвал перамогі – яблыневая квецень, я не георгіеўская стужка, як гэта ёсць у Расіі), так і ў распрацоўцы і татальным насаджэнні канцэпцыі «генацыду беларускага народа», якая пасля задушэння пратэстаў 2020 года стала ідэалагічным і прапагандысцкім інструментам у барацьбе з апанентамі ўлады, якія сталі атаясамлівацца з калабарантамі часоў Другой сусветнай вайны і трактуюцца як «спадкаемцы нацызму». Падобная фармулёўка ўжываецца і да заходніх краін, якія ўвялі санкцыі супраць беларускага рэжыму. Практычны план рэалізацыі канцэпцыі «генацыду беларускага народа» разлічаны, перадусім, на абсалютны ахоп сістэмы адукацыі (ад пачатковай школы да ўніверсітэтаў) і фармаванне лаяльнасці да рэжыму. Вызначальнай рысай змястоўнага напаўнення канцэпцыі з'яўляецца «спаборніцкая мартыралогія» – адвольнае павелічэнне лічбаў ахвяр, якія панесла Беларусь у вайне, што не мае пад сабой аніякага навуковага грунту, але мае выключна прапагандысцкую матывацыю.

З другога боку, нацыянальна арыентаваныя гісторыкі за ўвесь час незалежнасці РБ не выявілі належнай увагі да праблематыкі Другой сусветнай вайны, пакінуўшы яе на глыбокай перыферыі сваіх даследаванняў. Паказальным становіцца факт, што пераважная частка прац, прысвечаных нацысцкай акупацыі Беларусі, якія сталі аргументаванай антытэзай савецкім міфам, належыць замежным аўтарам. Нешматлікія працы беларускіх «вусных гісторыкаў» практычна не змянілі сітуацыю. Акрамя таго, пастведы і ўласныя перакананні даследчыкаў нярэдка прыводзілі да некарэктнага вытлумачэння вясковага наратыву пра вайну, што, у сваю чаргу, падкрэслівае неабходнасць антрапалагічнага падыходу пры даследаваннях вясковай супольнасці.

Рэпрэсіўная палітыка беларускіх уладаў і актыўная зачыстка імі адукацыйнага, навуковага, інфармацыйнага, сацыяльнага ландшафтаў краіны ў сукупнасці з адсутнасцю рэальных завершаных ініцыятыў беларускай навуковай супольнасці ў выгнанні (навучальныя праграмы, курсы, падручнікі, тэматычныя зборнікі, манаграфіі) прывялі да абсалютнай манаполіі дзяржаўна-прапагандысцкіх мадэляў у прасторы памяці пра Другую сусветную вайну ў Беларусі. Змястоўная аналітыка і крытыка незалежных аўтараў дзяржаўнай палітыкі ў гістарычнай сферы не адмяняе неабходнасці стварэння змястоўных навуковых і адукацыйных прадуктаў, дасяжных не толькі беларускім дыяспарам, але і беларускаму грамадству ў цэлым. Відавочным становіцца і тое, што пры распрацоўцы новых падручнікаў ці тэматычных даследаванняў па вайне мусіць быць належным чынам прааналізаваны погляд на вайну беларускіх вяскоўцаў, якія складалі пераважную большасць насельніцтва краіны ў часе акупацыі, без чаго падобная праца не мае сэнсу.

# ЛІТАРАТУРА


1. Ассман, Алейда. 2014. Длинная тень прошлого: Мемориальная культура и историческая политика. Москва: Новое литературное обозрение.

2. Бартушка, Марк. 2014. Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941–1944 гг., Смаленск: Інбелкульт.

3. Браточкин, Алексей. 2013. Память о Холокосте и нациостроительство в Беларуси и Украине (итоги 2000-х гг.). «Перекрестки»,1-2: 57-84.

4. Вабішэвіч А. [і інш.] 2007. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.5. Беларусь у 1917-1945 гг. Мінск: Экаперспектыва.

5. Ванагайте, Рута. 2016. Наши. Вильнюс: Альма Литтера

6. Геноцид белорусского народа = : Genocide of the Belarusian people : информационно-аналитические материалы и документы. Под общ. ред. А.И. Шведа. Минск: Беларусь, 2022.

7. Закон Республики Беларусь «О геноциде белорусского народа».

8. Іванова, Вольга. 2018. Прамоўленая гісторыя: XX ст. у памяці жыхароў беларускай вёскі. Мінск: Зміцер Колас.

9. Катлярчук А. 2013. Палітыка памяці у Беларусі. Мемарыялы Другой сусветнай вайны і меншасці краіны (яурэйская, польская ды цыганская). «Журнал беларускіх даследаванняў», 1: 7-40.

10. Коваленя А. 2026. Память о Великой победе – духовная скрепа для новых поколений белорусской молодежи. [В:] Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып.40. Мінск: Беларуская навука, 5-16

11. Ластовский, Алексей. 2009. Специфика исторической памяти в Беларуси: между советским прошлым и национальной перспективой. «Вестник общественного мнения», 4: 88–99.

12. Ластоўскі, А. 2015. Інтэрв'ю як метад: скрыжаванне сацыялогіі і вуснай гісторыі. [У:] Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі. Рэд. А. Смалянчук. Мінск: Зміцер Колас, 207-215.

13. Ластоўскі, Аляксей. 2025. Беларускія падручнікі па гісторыі як люстэрка дзяржаўнай гістарычнай палітыкі. Аналітычная запіска.

14. Литвин, Алексей [и др.]. 2015. Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне.  Минск: Беларуская навука.

15. Лобач, Уладзімір. 2025. «Уцялесненасць вайны» ва ўспамінах беларускіх вяскоўцаў пра перыяд нацысцкай акупацыі. «Przegląd Środkowo-Wschodni», 10: 247-268.

16. Лобач Уладзімір. 2025a. Я з вогненнай вёскі... Першая спроба вуснай гісторыі ў даследаванні нацысцкай акупацыі Беларусі. «Rocznik Centrum Studiów Białoruskich», 11: 103-116.

17. Льюис, С., Федор Д., Журженко, Т. 2018. Война и память в России, Украине и Беларуси. «Неприкосновенный запас». № 3

18. Мартыновский, Максим. 2022. Политика памяти как средство легитимации власти в Беларуси 2020–2022. [У:] CTRL+S. Спадчына як выпрабаванне. Навук. рэд. С. А. Стурэйка. Вільня: Ciklonas, 45-54.

19. Маховская, Ирина. 2021. Культура памяти о Холокосте: национальный vs локальный нарратив. «Цайтшрыфт. Часопіс для даследвання яўрэйскай гісторыі, дэмаграфіі і эканомікі, літаратуры, мовы і этнаграфіі», 8 (13):102-114.

20. Рудлінг, Пэр Андэрс. 2010. Лукашэнка і «чырвона-карычневыя»: дзяржаўная ідэалогія, ушанаванне мінулага і палітычная прыналежнасць. «Палітычная сфера», 14: 90-113.

21. Сацук, Сяргей. 2020. Белорусская власть пошла вразнос. «Народная воля». 01.09.2020: 2.

22. Смоленчук, Алесь. 2011. Память на Пограничье (на примере памяти о Второй мировой войне) [У:] Кравцевич А., Смоленчук А., Токть С. Белорусы: нация Пограничья. Вильнюс: ЕГУ, 159-206.

23. Снайдер, Тимоти. 2015. Кровавые земли: Европа между Гитлером и Сталиным. Київ: Дуліби.

24. Станкерас, Петрас. 2009. Литовские полицейские батальоны. 1941-1945 гг. Москва : Вече.

25. Толкачев и др. 2023. Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны. 5-9 классы. Учебное пособие. Минск: Адукацыя і выхаванне.

26. Томсон, Пол. 2003. Голос прошлого. Устная история. Москва: Изд. «Весь мир».

27. Хальбвакс, Морис. 2005. Коллективная и историческая память. [В:] Память о войне 60 лет спустя: Россия, Германия, Европа. (ред.) М. Габович. Москва: Новое литературное обозрение, 16-50.

28. Ходасевич Антон. Лукашенко выставит Германии счет. Независимая газета. 26.07.2021.

29. Шыбека, Захар. 2003. Нарысы гісторыі Беларусі (1795 – 2002). Мінск: Энцыклапедыкс.

30. Шепелев, Георгий. 2023. Память о Второй мировой войне: точки противоречий, площадки и перспективы для диалога. Европа, Франция, Россия и Беларусь. [В:] Сталинградская битва: правда и вымыслы (по материалам мировой печати): мат-лы 5-й Междунар. научно-практич. конф., Москва 2023: 32-74.

31. Bratachkin, Aliaksei. 2022. The Politics of Memory in Belarus after 2020: Securitisation, Memorial Laws, Instrumentalisation of History. [In:] Constructing Memory: Central and Eastern Europe in the New Geopolitical Reality, ed. Hanna Bazhenova. Lublin: IEŚ, 187-206.

32. Grabowski, Jan. 2020. Na posterunku. Udział polskiej policji granatowej i kryminalnej w zagładzie Żydów, Wołowiec: Wydawnictwo Czarne.

33. Gross, Jan Tomasz. 2000. Sąsiedzi. Historia zagłady żydowskiego miasteczka. Sejny: Pogranicze.

34. Engelking, Anna. 2018. O antropologicznym (etnologicznym) opisie przeszłości. Prolegomena. «Kwartalnik historii kultury materialnej», 2:143-149.

35. Lastouski, Aliaksei. 2022. Recoding the Nation: Historical Politics in Belarus after the 2020 Protests, [In:] Constructing Memory: Central and Eastern Europe in the New Geopolitical Reality, ed. Hanna Bazhenova. Lublin: IEŚ, 163–186.

36. Aliaksei Lastouski. 2025. History as Militaristic Rhetoric: Historical Politics in Belarus after. [In:] History as a Battlefield: Conflicting Interpretations of the Past in Central and Eastern Europe, Policy Papers, edited by Hanna Bazhenova, 4: 47-60

37. Łuczak, Czesław. 1993. Polska i polacy w drugiej wojnie światowej. Poznań: Wydaw. nauk. UAM.

38. Ramanava, Iryna. 2023. «Mind must be painted uniformly»: Teaching History in Belarusian Schools. «Belarus Research Network on Neighborhood Policy».

39. Raport o stratach poniesionych przez Polskę w wyniku agresji i okupacji Niemieckiej w czasie II wojny światowej 1939-1945. Warszawa: MSZ, 2023.

# АЎТАР



## Уладзімір Лобач

Незалежны даследчык.



Погляды, выказаныя ў гэтым матэрыяле, з'яўляюцца адказнасцю аўтараў
і не абавязкова адлюстроўваюць пазіцыю каманды Банка Ідэй.